# Пазакласнае мерапрыемства «Прыехала Каляда ў вазочку»

**Н. М. Садзілава,**
настаўнік музыкі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
СШ № 9 г. Жлобіна

**Мэта:** садзейнічаць знаёмству вучняў з асаблівасцямі абраду **«Каляды».**

**Задачы:**

- садзейнічаць выхаванню ў вучняў патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці сродкамі беларускага музычнага фальклору і народных танцаў;
- спрыяць развіццю ў школьнікаў творчых здольнасцей, эстэтычнаму выхаванню.

**Абсталяванне:** калядная зорка, маскі казы, мядзведзя, бусла, ваўка; беларускія народныя касцюмы; музычныя інструменты (баян, бубен, трашчоткі, дудкі).

**Музычны матэрыял:** беларускія народныя песні “Добры вечар, госці”, “Учора звячора”, “Го-го-го, каза”, “Прыехала Каляда ў вазочку”; беларускія народныя танцы “На рэчаньку”, “Базар”, “Бабачка”.

**Ход мерапрыемства**

**I. Арганізацыйны этап**

**II. Асноўны этап**

*Заходзяць калядоўшчыкі, спяваюць.*

1. Добры вечар, госці, просім вас мілосці.

   Добры вячор, шчодры вячор!

2. Ой, ды нашы хлопцы пайшлі шчадраваці.

3. Ой, ды шчадравалі, у вокны заглядалі.

4. На новае лета, радзі божа жыта.

**Гаспадыня.** Калядоўшчыкі ідуць! Заходзьце, заходзьце, даражэнькія! Я вас даўно чакаю, у вокны паглядаю!

**1 вучань.** Добры вечар, шчодры вечар!

**2 вучань.** Ходзім грамадой, усіх віншуем з Калядой!

**3 вучань.** З Калядою вас вітаем, шчасця, радасці жадаем!

*Гучыць песня.*

Учора звячора засвяціла зора.

Зора засвяціла – свет узвесяліла.

Свет узвесяліўся, Хрыстос нарадзіўся.

Хрыстова раджэнне – людзям на збаўленне.

Людзі, прыбягайце – Хрыста прывітайце.

Здаровы бывайце, нам Каляду дайце.

Здаровы святкуйце, дайце не шкадуйце.

**Хлопец.** Шчасця, радасці таму, хто жыве ў гэтым даму!

**Дзяўчына 1.** Гаспадынька, каб у тваём статку было ўсё ў дастатку!

**Дзяўчына 2.** Каб у вашай хаце не змаўкаў смех дзіцяці!

**Дзяўчына 3.** Ой ты, гаспадынька, запалі свечку ды ідзі ў клетку.
Набяры грэчкі, а паверх яечкі!

**Хлопец.** Ты, гаспадыня, не ляніся, каля бочкі павярніся,
Нясі квас вядром, а пірагі мяшком!

**Дзяўчына 1.** Шчодрык-бодрык, дай варэнік,
Гаршочак кашкі, наверх каўбаскі!

**Дзяўчына 2.** Шчадрую-шчадрую, дзесьці сала чую,
Дайце каўбасу – бацьку панясу.
Бацька будзе есці ды барадою трэсці,
Вусамі ківаць ды Бога ўспамінаць!

**Хлопец.** Мы да вас ішлі ды казу знайшлі. Ну, каза, пакажыся, усім людзям пакланіся.

*Калядоўшчыкі спяваюць.*

Го-го-го, каза, го-го, шэрая!

Дзе каза нагой, там жыта капой.

Дзе каза хвастом, там жыта кустом.

А дзе каза рогам, там жыта стогам.

Дзе каза бывае, там шчасце вітае.

*Каза танцуе, а потым падае.*

**Хлопец.** Што ж гэта стала? Мая каза ўпала, ссохла, прапала! Бачна, даўно не ела, што так аслабела… Дайце казе сала, каб яна ўстала. Ну-ка, козанька! Стань, расхадзіся, усім пакланіся!

**Гаспадыня.** Вось, дадзім казе сала, каб яна ўстала! А для механошы – жменю грошай. І кожнаму каляднічку па піражочку. Дзякуй вам за вашы Каляды *(гаспадыня дае калядоўшчыкам пачастункі)*.

**Каза.** Дзякуй за пачастункі. Я – Каза калядная, прыгожая ды ладная! Я і гора, і бяду вакол рога абвяду! Святкуем Калядкі – лавіце зярняткі! Каб ваша гаспадарка была ў парадку. Каб жыта ўрадзіла ўсім на дзіва!

**Дзяўчынка.** Кланяюся нізка ўсім, і Мішка таксама кланяецца (*ківае галавой*). Ну-ка, Міша, павесялі народ, пакажы нам, як бабы хлеб месяць! *(Мядзведзь паказвае*).

Пакажы, як маладыя хлопцы косяць *(Мядзведзь паказвае*). Пакажы, Міша, як мужык дровы рубіць *(мядзведзь паказвае*). Дзякуй, мішка, малайчына, павесяліў народ.

**Гаспадыня.** Ой, які вумны мядзведзік, трэба і яго пачаставаць (*дае пачастунак*).

**Важак.** Падзякуй Міша гаспадыні (*Мядзведзь нізка кланяецца*).

*Бусел кланяецца гледачам. Раптам выскоквае Воўк. Усе палохаюцца.*

**Воўк.** А я ваўчок – шэры бачок! О, якая смачная вячэра ў мяне сёння будзе!

**Бусел.** Пачакай трошкі, Воўча. Лепей адкажы нам, а чаго ў цябе лапы крывыя?

**Воўк.** Лапы крывыя – жар заграбаць.

**Бусел.** А чаго ў цябе, воўча, хвост бухматы?

**Воўк.** Хвост бухматы – печ вымятаць.

**Бусел.** А чаго ў цябе, воўча, зубы вострыя?

**Воўк.** Зубы вострыя – цябе з’есці!

**Бусел** (*уцякае ад воўка і крычыць*). Ой, ратуйце, ратуйце мяне!

**Дзяўчынка.** Ах, ты воўк! Бусліка нашага замарыў! Хопіць жартаваць! Станавіцеся ўсе, будзем танцаваць! Ну-ка рэзні, гарманіст, залатыя пальчыкі, каб пусціліся ў скок нашы калядоўшчыкі!

*Выконваюцца танцы “На рэчаньку”, “Базар”, “Бабачка”.*

**Хлопец.** Дзякуй, гаспадарочкі, што нас пачаставалі!

**Дзяўчына.** Каб за еты піражок урадзіла жыта стажок!

**Дзяўчына.** Каб заўсёды была хата прыбрана, міскі-ложкі памыты, а вашы дзеткі сыты!

1. Прыехала Каляда ў вазочку, да на сівенькім канёчку.
   Каляда, Каляда, Калядзіца, ты добрая маладзіца.
2. Прыехала Каляда ў вечары, прывезла пірагоў, печыва.
   Каляда, Каляда, Калядзіца, ты добрая маладзіца.
3. Ой, чакалі Каляду дзяўчаты, прывязла яна ім дудак рэшата.
   Каляда, Каляда, Калядзіца, ты добрая маладзіца.